журналистики главная задача – изучение лучших наработок блогеров, обогащение своей практики на уровне тем, форматов, творческих, монетизационных схем.

*Литература*

1. Виноградов, Д. 7 Вопросов Самсону Шоладеми, блогеру / Д. Виноградов // Русский репортер [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://rusrep.ru/article/print/140056/. – Дата доступа : 20.08.2017.
2. Вот кто на самом деле «хайпанул» на ажиотаже вокруг блогера Влада Бумаги // Про бизнес [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://probusiness.io/null/3434-vot-kto-na-samom-dele-khaypanul-na-azhiotazhe-vokrug-blogera-vlada-bumagi.html. – Дата доступа : 20.08.2017.
3. Ву, Т. Главный рубильник. Расцвет и гибель информационных империй от радио до интернета / Т. Ву. – М. : Манн, Иванов и Фербер, 2012. – 384 с.
4. Республика Беларусь в зеркале социологии : сборник материалов социологических исследований за 2015 год / под общ. ред. А. П. Дербина. – Минск : ИАЦ, 2016. – 212 с.

**Галіна Тычко**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# УРОКІ КЛАСІКА: КУЗЬМА ЧОРНЫ ВАЧЫМА СУЧАСНІКАЎ І НАШЧАДКАЎ

У наш хуткаплынны і мітуслівы час чалавеку як быццам няма патрэбы азірацца назад, паглыбляцца ў мінулае, асабліва калі яно было не такім светлым і бязвоблачным, як хацелася б. Але пры ўсёй шматстайнасці выбару крыніц інфармацыі забаўляльнага і пазнавальнага плана класіка застаецца заўсёды запатрабаванай. Неперааўзыдзенай. Здольнай захапляць і здзіўляць новымі адкрыццямі глыбінь чалавечай душы, невычэрпнасці і неспазнанасці яе свету. Такой падаецца сёння спадчына і постаць Кузьмы Чорнага, нашага знакамітага класіка, самабытнага пісьменніка, чалавека глыбокай і далікатнай душы, вялікага сэрца, творцы, які стаяў ля вытокаў сучаснай беларускай журналістыкі. Як вядома, у 1924–1928 гг. ён працаваў у газеце «Беларуская вёска» (сучасная «Сельская газета»), а пазней у гады Вялікай Айчыннай вайны ў газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941–1944) і часопісе «Беларусь». Першы твор Кузьмы Чорнага быў апублікаваны на старонках газеты «Савецкая Беларусь», яго проза і публіцыстыка фактычна была вядучай на старонках тагачаснай беларускай прэсы.

Сёння па-новаму адкрываецца глыбіня і веліч класіка, асабліва калі бачыш пісьменніка ў кантэксце яго складанага гістарычнага часу, у по-

вязях з тагачасным літаратурным і сацыяльна-палітычным асяроддзем; вачыма сямейнікаў, знакамітых пісьменнікаў, сяброў і добрых знаёмых. Такім ён паўстае са старонак унікальнай кнігі «Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв'ю, дакументы», укладзенай вядомай журналісткай і руплівіцай на ніве беларускага мастацкага слова Галінай Шаблінскай, якая ўжо выступала як укладальніца кніг серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі» і склала тамы, прысвечаныя Янку Купалу і Уладзіміру Караткевічу. Постаць творцы, яго пісьменніцкая і чалавечая індывідуальнасць падаюцца праз асабістыя сведчанні Кузьмы Чорнага, яго аўтабіяграфію, дзённікавыя запісы, фрагменты твораў. Складаны свет пісьменніцкай душы мы спазнаем праз інтэрпрэтацыю яго літаратурнай спадчыны даследчыкамі XX ст. і сучаснымі, праз успрыманне людзей, якія асабіста ведалі і кантактавалі з пісьменнікам, і тых, хто адкрываў Кузьму Чорнага як класіка нацыянальнай літаратуры. Такое шматгалоссе, своеасаблівы, паводле азначэння С. Алексіевіч, «жанр чалавечых галасоў», «дакументаў чалавечай душы» дае свой плён.

Існуе некалькі варыянтаў аўтабіяграфіі К. Чорнага, напісаных у розны час і з розных нагод, а таксама захаваліся звесткі біяграфічнага характару ва ўспамінах дачкі пісьменніка Рагнеды Раманоўскай і ў асабістых запісах самога Чорнага. Цікавым сведчаннем пра даваенны і пасляваенны час з'яўляюцца «Нататкі да біяграфіі Кузьмы Чорнага» В. Вольскага, сучасніка К. Чорнага, аўтабіяграфічны нарыс С. Александровіча «Сэрца, у якім месціцца цэлы свет», а таксама інтэрв'ю Г. Каржанеўскай з дачкой пісьменніка Рагнедай Раманоўскай і інтэрв'ю Г. Шаблінскай з яго ўнукам Міколам Раманоўскім. З успамінаў і выказванняў блізкіх паўстае воблік жывога чалавека, Кузьмы Чорнага, які, аказваецца, насуперак псеўданіму, быў бялявы, вясёлы і дасціпны. Рагнеда Мікалаеўна прыгадвае шмат розных смешных гісторый, расказаных бацькам, і пра сваіх блізкіх сваякоў, і пра суседзяў – цімкаўцаў. Іван Мележ, які аддаў на суд Чорнаму свае апавяданні якраз напярэдадні яго першага інсульту, прыгадвае, як быў здзіўлены і ўзрушаны тым, што хворы пісьменнік, які сам не мог чытаць, папрасіў дапамогі дачкі і літаральна праз некалькі дзён напісаў пачаткоўцу грунтоўны адказ. «Чуў я ад таварышаў, што людзі ад Чорнага выходзілі бадзёрымі, выходзілі з жаданнем працаваць... – прыгадваў І. Мележ. – Гэта было добрае, чулае да людзей сэрца. Мусіць, ад гэтай сваёй дабрыні, ад чуласці, а можа, ад пераканання, што лагоднае, добразычлівае слова больш дае сілы чалавеку, чым лаянка, ён

людзям, што адкрывалі яму першыя запаветныя свае сшыткі, задумы, часта гаварыў добрыя абнадзейлівыя словы» [1, с. 259].

У свой час на старонках многіх беларускіх выданняў змяшчаліся разнастайныя матэрыялы, прысвечаныя даследаванню пісьменніцкага феномена Кузьмы Чорнага, якія належалі пяру вядомых пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў. Гэтыя публікацыі былі прысвечаны ацэнцы і інтэрпрэтацыі мастацкіх і публіцыстычных твораў Кузьмы Чорнага. Развагі А. Адамовіча, Я. Брыля, В. Адамчыка, В. Быкава пра феномен Чорнага і яго ролю ў нашай літаратуры ў пэўнай ступені бяруць свой выток з ацэнак, выказаных на пачатку ХХ ст. у артыкуле «“Зямля” Кузьмы Чорнага» Адама Бабарэкі – нашага выдатнага крытыка-ўзвышэнца, які заўчасна загінуў у гады рэпрэсій. Дзённікавыя запісы самога Кузьмы Чорнага, яго ліставанне і іншыя дакументы, звязаныя з жыццём і смерцю класіка, з пазіцый сённяшняга дня каментуе М. Мушынскі ў артыкуле «Мемуарная і эпісталярная спадчына Кузьмы Чорнага». Памяць вялікага класіка ўшаноўваецца на Беларусі не толькі ў Літаратурным музеі Чорнага ў Цімкавічах, але і дзякуючы папулярызацыі яго спадчыны праз СМІ. У 2014 г. на Беларускім радыё, дзякуючы ініцыятыве Г. Шаблінскай, адбылася прэм’ера радыёспектакля «Млечны шлях» паводле аднайменнага рамана К. Чорнага.

Усе гэтыя шматлікія матэрыялы і дакументы ствараюць складаны і светлы воблік Кузьмы Чорнага – пісьменніка і чалавека. Часам нечаканы, непрадказальны, велічны і ў той жа час па-чалавечы просты і абаяльны ў праявах і дробязях штодзённага жыцця. У юнацтве Кузьма Чорны, аказваецца, спяваў у царкоўным хоры, а напрыканцы жыцця, прадчуваючы хуткую смерць, ён пакінуў у сваім дзённіку трагічны запіс: «Божа, памажы мне напісаць мае раманы» [1, с. 170]. Дачка таксама прыгадвае, як шчыра маліўся ён, застаючыся адзін у сваім кабінеце аб уратаванні ад смерці [1, с. 47]. Як вынікае з успамінаў сваякоў, сям’я пісьменніка была надзвычай талерантнай у дачыненні рэлігіі, тут паядналіся каталікі, уніяты, праваслаўныя, сам Чорны пазней, ажаніўшыся з габрэйкай, пазнаёміўся і з іўдаізмам. Ёсць яшчэ адзін цікавы факт, пра які згадвае сястра Чорнага – Марыя Карлаўна: будучы пісьменнік нарадзіўся ў маёнтку Боркі, які належаў фундатару Чырвонага касцёла Эдварду Вайніловічу, дзе ў той час арандаваў зямлю яго бацька [1, с. 32]. Мікола Раманоўскі, унук пісьменніка, прыгадваючы сямейныя гісторыі, расказвае, як выяўлялася беларуская сялянская натура ў вобліку вялікага пісьменніка: «Адзінае рознагалоссе ў Чорнага з жонкай, я чуў, было наконт таго, як бульбу абіраць. Чорны абіраў бульбу

па-вясковаму: шах-шах – і гатова: паўбульбіны ідзе ў шалупінне – свінні ўсё з’ядуць. А бабуля – па-гарадскому: ашчадна, тоненька» [1, с. 53].

Новыя акцэнты выяўляюцца і ў вытоках творчага майстэрства Кузьмы Чорнага. Агульнавядома, як любіў беларускі класік творчасць А. дэ Бальзака, Ф. Дастаеўскага, як шмат вучыўся ў іх. Грунтоўна і пераканаўча расказвае сённяшнім чытачам пра гэта выдатная кніга А. Адамовіча «Маштабнасць прозы : Урокі творчасці Кузьмы Чорнага» (1972). Але, аказваецца, быў у Чорнага і другі кумір у вялікай літаратуры – нарвежскі пісьменнік XX ст. Нобелеўскі лаўрэат Кнут Гамсун, творчасць якога ў савецкай літаратуры стала больш-менш вядомай у 1980-я гг. У размове з А. Зарыцкім Чорны, паказваючы на партрэт Гамсуна, які вісеў у яго кабінеце, сказаў: «Вось гэта той парог, праз які мне ў маладыя гады давялося пераступіць» [1, с. 161]. Высокая праўда і мастацкасць творчай спадчыны Кузьмы Чорнага, якія так кранаюць душу чытача, па-новаму прачытваюцца і ўспрымаюцца сёння праз прызму яго няпростага жыццёвага лёсу, праз далучэнне да праяў яго жывой чалавечай душы.

*Літаратура*

1. Кузьма Чорны. Чалавек – гэта цэлы свет : успаміны, эсэ, артыкулы, інтэрв’ю, дакументы / укл. Г. Шаблінская. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. – 510 с.

**Василий Федоров**
*Челябинский государственный университет (Россия)*

## НОМАДИЧЕСКАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА КОММУНИКАТИВНОГО ПОВЕДЕНИЯ ПОЛЬЗОВАТЕЛЕЙ СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЕЙ *

«Номадический проект» впервые был предложен в работах постмодернистских философов Ж. Делеза и Ф. Гваттари [1]. Данное понятие стало основой для описания нового типа культуры и новой метафизики, заявивших о себе в западном обществе в постиндустриальную эпоху. М. А. Можейко, комментируя труды названных философов, выделяет такие ключевые характеристики, формирующие социальность и психологию актора постмодерна: «фундаментальная для постмодернизма установка на отказ от характерных для классической метафизики презумпций, а именно: а) презумпции жестко структурной организации бытия; б) полагания пространства в качестве дискретно дифференцированного посредством семантически и аксиологически определяющих